**Swiatłana Dzianisowa**
*Grodno*
*Redakcja czasopisma „Młodość”*

# НЕВЯДОМЫЯ РЫСЫ НАТУРЫ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ Ў СВЕЦЕ ГАМЕАПАТЫІ

Ідэя гэтай працы ўзнікла ад цалкам натуральнага для даследчыка жадання „ўбачыць” аб’ект сваёй зацікаўленасці ў літаральным сэнсе „на свае вочы”, „сустрэцца” з пісьменніцай Элізай Ажэшкай як сучасніцай і нават добра знаёмай. Мэта знешне выглядае досыць авантурна: даведацца, напрыклад, што пані Эліза піла ахвотней – гарбату ці каву? Любіла яна салодкае ці аддавала перавагу востраму і салёнаму? Была „савою” ці „жаўруком”? Якія мела голас і дыкцыю, манеры, паходку? Якія любіла колеры? Была „акурацісткай” ці да парадку навокал ставілася абыякава? За несур’ёзнасцю гэтых пытанняў хаваецца вялікая карысць для стваральнікаў біяграфічных раманаў (а мо і мастацкага фільма). Але ці ёсць насамрэч спосаб даведацца пра чалавека, які жыў вельмі даўно, нешта такое, пра што дакладна невядома і што ў крыніцах не засведчана? Калі гэтае „нешта” ёсць густы і звычкі, здольнасці і схільнасці, асаблівасці канстытуцыі і тэмпераменту, прынцыпы паводзінаў і светапогляд, то асмелімся меркаваць, што спосаб такі існуе.

Апрабаванне гамеапатыі ў якасці сродка, які садзейнічае стварэнню максімальна дакладнага, псіхалагічнага партрэта асобы, ад часу жыцця якой нас аддзяляюць стагоддзі, можа паслужыць адным з падыходаў у справе пераадолення суб’ектывізму ў біяграфічных даследаваннях.

Ідэя на першы пагляд можа падацца ўтапічнай, але ўтапічнасць яе часткова нівеліруецца вынікамі аналагічных спроб, прароблены у рэчышчы стасункаў літаратуразнаўства і псіхааналітыкі. У прыватнасці, прафесар Каліфарнійскага ўніверсітэта Дэніел Ранкур-Лафер’ер, які спецыялізуецца на псіхааналізе рускай літаратуры, даволі

паспяхова запазычвае методыкі псіхааналітыкаў узроўню Зыгмунда Фрэйда з тым, каб убачыць, як асабістая праблема пісьменніка можа заявіць аб сабе і атрымаць „літаратурнае ўвасабленне ў канкрэтным сціслым творы”[1].

Польская даследчыца літаратуры прафесар Данута Данэк для стварэння псіхалагічных партрэтаў пісьменнікаў мінуўшчыны задзейнічае аналіз вобразаў і метафар, выкарыстаных імі ў творчасці, а таксама тых уражанняў і эмоцый, рэмінісцэнцый і рэфлексій, якімі насычаны іх аўтабіяграфічныя тэксты ці тое, што прынята называць эпісталярнай спадчынай. Спасылаючыся на сцвярджэнне Зыгмунда Фрэйда – маўляў, цяжка псіхааналітыку адкрыць нешта новае, чаго перад тым не адчуў бы паэт, – Данута Данэк, вобразна кажучы, „пасадзіла” Элізу Ажэшку на кушэтку знакамітага доктара[2]. Прынамсі, тая хранічная меланхолія, на якую пісьменніца пакутавала ўсё сваё жыццё, была патлумачана акалічнасцямі яе дзяцінства – смерцю бацькі і сястры, дэспатычнасцю маці, доўгім растаннем з домам, а таксама ранім і хуткім замуствам і непадзеленым каханнем.

Такім чынам, Эліза Ажэшка зноў ператвараецца ў пацыентку, якая карыстаецца машынай часу. На гэты раз яна „запісана” ў кабінет спецыяліста па гамеапатыі. Гэты медыцынскі напрамак адрозніваецца ад традыцыйнага (алапатыі) тым, што лекавыя сродкі ўздзейнічаюць не на хваробу, а на хворага, бо і сама хвароба з пазіцый гамеапатыі ёсць не пагаршэнне здароўя, а працэс яго ўзнаўлення[3]. Эфектыўнасць уздзеяння на арганізм неймаверна малой (гамеапатычнай) колькасці пэўнага рэчыва тлумачыцца тым, што пры хваробе ў пашкоджаных тканках узнікае, вобразна кажучы, „высокае напружанне”. Яно і ёсць прычына парушэння функцый. Але галоўны сэнс у тым, што такія „высоканапружаныя” тканкі неахвотна ўспрымаюць моцныя раздражняльнікі, а вось слабыя і спецыфічныя – вельмі ахвотна. Асабліва ўдзячна арганізм адгукаецца на так званы канстытуцыянальны прэпарат, які адпавядае канстытуцыянальнаму тыпу – такой арганізацыі біялагічнага аб’екта,

[1] Ранкур-Лаферьер Д. „Крейцерова соната”. Клейнианский анализ толстовского неприятия секса / Доклад на пленарном заседании 15-й международной конференции „Психоанализ, литература, искусство”, Санкт-Петербург, 4 июня 1998-го года / Классический психоанализ и художественная литература / Сост. и общая редакция В. М. Лейбина. – СПб.: Питер, 2002. – С. 141–161.

[2] Danek D. „Urodzona w pustym gnieździe”. Melancholia i pamięć nieświadoma Elizy Orzeszkowej / Danek Danuta // Śmierć wewnętrzna. Literatura w świetle doświadczenia psychoanalitycznego / Gdańsk: Słowo/obraz terytoria, 2012. – S. 127–179.

[3] Кёлер Г.. Гомеопатия. Смоленск: Гомеопатическая медицина. – 1997. – 600 с.

якая стварае звышадчувальнасць да некаторых рэчываў, да якіх іншыя арганізмы могуць быць абсалютна неадчувальнымі. Пошук такога рэчыва для Элізы Ажэшкі, вызначэнне яе канстытуцыянальнага тыпу – гэта і ёсць задача нашага даследавання.

Тое, што становіцца вядомым урачу з падрабязных расповедаў пацыента (у нашым выпадку – з лістоў, успамінаў і дзённікаў, праз аналіз душэўных перажыванняў, засведчаных у публіцыстычных і мастацкіх творах), а таксама неаспрэчныя факты біяграфіі і скаргі на фізічныя недамаганні (як непасрэдная прычына візіта да ўрача), – усё гэта стварае пэўны вобраз, які дазваляе ўрачу вызначыць канстытуцыянальны тып асобы і падабраць адпаведны канстытуцыянальны прэпарат.

Адзначым яшчэ, што канстытуцыянальным тыпам па традыцыі даюцца лацінскія назвы, аднаіменныя з такімі рэчывамі, і накіруемся, нарэшце, у кабінет гамеапата, дзе нас ужо чакае пацыентка Ажэшка Эліза, па роду дзейнасці пісьменніца, жыхарка горада Гродна з агаворкай на другую палову XIX стагоддзя. Асноўныя скаргі – на частыя галаўныя боль, адышку, слабасць сардэчнай дзейнасці і той пакутліва-меланхалічны настрой, той невыносны сум, які ўзнікае або беспадстаўна, або на фоне цішыні, бою гадзінніка, гукаў фартэпіяна, крыкаў мужыкоў у полі, касцёльнага звону[4].

Сярод іншага, што становіцца вядомым праз вывучэнне лістоў Элізы Ажэшкі, яе успамінаў, запісаў у кніжцы najosobistszych, „najtajemniejszych notatek"* пад назвай „Dnie" (Дні), з аналізаў мастацкіх і публіцыстычных твораў, а таксама біяграфічных фактаў, варта назваць наступнае:

– назіральнасць, вобразнасць мыслення, дасціпнасць;

– актыўнасць і прадпрымальнасць, патрэба ў давядзенні пачатага да завяршэння;

– самаахвярнасць, імпульсіўнасць меркаванняў з наступным шкадаваннем, удзячнасць, клопат аб людзях, патрэба ў прыязных размовах і прысутнасці побач блізкага па духу чалавека, моцная прывязанасць да пэўных асоб;

– патрэба ў станоўчай ацэнцы творчасці і сяброўскай парадзе, моцная прага пісьменніцкай працы, вялікая любоў да чытання;

– добрае самаадчуванне ў вёсцы і нецярпенне многіх акалічнасцей

[4] Orzeszkowa, E. Listy zebrane / E. Orzeszkowa; do druku przygotował i komentarzem opatrzył E. Jankowski. – T. I–IX. – Wrocław, 1954–1981.

* Najosobistrze, najtajemniejsze notatki (польск.) – очень личные, очень таинственные заметки

гарадскога жыцця, любоў да прыроды, зацікаўленасць батанікай, веданне псіхалогіі людзей, асаблівая ўвага да раслін і птушак;

– захапленне рукадзеллем, любоў да стужак і карункаў у адзенні;

– жаданне рабіць падарункі;

– адчуванне адзіноты, непрыязнасць да жыцця, плаксівасць[5].

Асоба з такімі характарыстыкамі найбольш адпавядае канстытуцыянальнаму тыпу *Natrum muriaticum***. Прэпарат з такой назвай мае хімічную формулу звычайнай кухоннай солі – NaCl. Гамеапаты называюць *Natrum muriaticum* прэпаратам хранічнага гора і выкарыстоўваюць для лячэння працяглых перажыванняў, выкліканых стратай блізкага чалавека. Асобы тыпу *Natrum muriaticum* пераважна інтраверты і пакутнікі, вельмі няўпэўненыя ў сабе, але так моцна падаўляюць эмацыйны боль, што могуць здавацца адкрытымі, шчаслівымі і досыць упэўненымі. Боль жа іх цягнецца звычайна з дзяцінства, яго звязваюць часцей за ўсё з бацькоўскай агрэсіўнасцю.

„Такія пацыенты схільныя не проста да класічнай дэпрэсіі, меланхалічнага суму, але і да хранічнай прагі смерці", – піша Кэтрын Култэр, характарызуючы тып *Natrum muriaticum*[6]. А хіба мы не памятаем, як часта Эліза Ажэшка канстатуе свае слёзы ў „таемным нататніку", як настойліва просіць Бога забраць яе?

*Samotność bez granic.*
*Straszna tęsknota!*
*Zniechęcenie do wszystkiego.*
*Wiele dziś płakałam.*
*Wszyscy zawodzą – wszyscy obcy – tylko śmierć pewna, ale kiedy?**

Пацыенты тыпу *Natrum muriaticum* часта скардзяцца на галаўны

[5] Budrewicz Tadeusz. Ptaki i ludzie w opowiadaniach Orzeszkowej / Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности. Сборник научных работ. – ГрГУ им. Я. Купалы, 2011. – С. 100–108.

** Natrum muriaticum (лац.)

[6] Култер Кэтрин Р. Портреты гомеопатических препаратов. Психосоматический анализ избранных конституциональных типов. Часть 2. – Москва: Гомеопатическая медицина, 2004. – 100 с.

* Адзінота без межаў
Страшная туга!
Нічога не хочацца
Сёння многа плакала
Усе разчароўваюць мяне – усе чужыя – толькі смерць бяспечная, але калі?

боль, які літаральна „расколвае галаву напалам”, і дрэнны настрой у першай палове дня. Пані Эліза скардзіцца на „шалёныя мігрэні” і часта канстатуе „ранак у ложку”. Кэтрын Култэр піша, што сонечныя промні, якія даюць свету цяпло і энергію, не ідуць на карысць *Natrum muriaticum*, бо дрэнна ўплываюць на скуру і вочы, выклікаюць агульнае дрэннае адчуванне і слабасць. З лістоў Элізы Ажэшкі мы ведаем пра „*afrykańskie skwary*” (афрыканскую спякоту) ў Гродне. *Natrum muriaticum* можа пакутаваць ад хваробаў вачэй – блефарытаў, кан'юнктывітаў, неўралгіі раснічнага нерва і слабасці мышц вачэй. І мы памятаем, як яна то скардзіцца, што ні пісаць не можа, ні чытаць, то раптам радасна паведамляе, у прыватнасці, Юзафу Сікорскаму, што вочы яе значна палепшалі, што „*акуляры я ўжо не кідаю ў кут*”4.

Характэрная знешняя прыкмета канстытуцыянальнага тыпу *Natrum muriaticum* – глыбокія зморшчынкі, якія ідуць ад крылаў носа да куточкаў вуснаў. На фотаздымку Элізы Ажэшка з пазнакай *Sadovski&Kozlovski / Grodno* мы бачым такія зморшчынкі.

Пералічым яшчэ колькі характарыстык тыпу *Natrum muriaticum*. Усе яны адпавядаюць асобе Элізы Ажэшкі і пацвярджаюцца лістамі, успамінамі, творчасцю і біяграфічнымі фактамі:

– можа з задавальненнем гадзінамі сядзець у сваім пакоі або працаваць у адзіноце;

– любіць аналізаваць чалавечую натуру, імкнецца зразумець, як „працуюць” дух і свядомасць;

– дэманструе вялікую здольнасць пакутаваць за іншых; калі не мае асабістых прычын для пакут, атаясамлівае сябе з прыгнечанай і непрызнанай часткай чалавецтва або культывіруе ў сабе апантанасць гістарычнымі пакутамі сваёй нацыі;

– несуцяшальны, не здольны забыць пра душэўныя раны, пастаянна культывіруе траўмуючыя ўспаміны; доўга не можа мірыцца са смерцю любімага чалавека;

– рэдка хваліцца, хутчэй недаацэньвае свае дасягненні; лягчэй прасоўвае нечую справу, чым сваю;. калі славалюбівы, то славалюбівы без шуму;

– „слязлівая дэпрэсія”, вялікая схільнасць да плачу, але пасля працяглых гераічных стрымліванняў;

– нават у выпадку „падзеленага кахання” можа паставіць сябе ў такія ўмовы, якія зробяць асабістую трагедыю непазбежнай; верагодна, справа тут у выбары аб'екта кахання – ён ажыццяўляецца ў падсвядомым страху перад пачуццём;

– апраўдваецца, выбачаецца і тлумачыць занадта шмат, чым ставіць сябе ў яшчэ больш няёмкае становішча, пра што ведае, але нічога з гэтым не можа зрабіць.

Такім чынам, калі б Эліза Ажэшка трапіла на гамеапатычны прыём, ёй быў бы прапісаны курс *Natrum muriaticum*. Пісьменніцу гэта магло б пазбавіць ад многіх псіхалагічных і фізічных праблем, але хто ведае, ці мелі б мы такую пісьменніцу? Варта лічыць важным іншае пытанне: што так інфармацыя дае даследчыкам яе жыцця сёння?

Для пачатку адкажам на тыя „несур'ёзныя" пытанні, якія могуць хваляваць патэнцыйнага аўтара біяграфічнага рамана (або рэжысёра мастацкага фільма): кава ці гарбата? Салёнае ці салодкае? Найбольш верагодна, што яна аддавала перавагу гарбаце. Любіла салёнае і шакалад. Паходка ў яе магла быць імклівая, хуткая – як у чалавека, які дакладна ведае, куды яму трэба ісці, і спяшаецца трапіць у патрэбнае месца як мага хутчэй. Па баках яна не пазірала. Тулава магла нахіляць уперад, злёгку выцягваючы шыю. Ногі яе часта стамляліся, з-за чаго яна пачынала ступаць цяжка або „цягнуць" іх, таму абцасы на яе абутку часта сціраліся. Як гэтую звычку даказаць? Ці ацалела хоць пара абутку пані Элізы і дзе яе можна шукаць?..

Пры ўсёй элегантнасці яе знешнасці і паводзін рухам яе гэтай самай элегантнасці, свабоды і спрыту магло не хапаць: ёсць вялікая верагоднасць, што яна часта рассыпала тое, што сыплецца, разлівала тое, што ліецца, разбівала крохкае, раніла рукі вострым, чаплялася за куты мэблі.

Пры ўсёй яе здольнасці фармуляваць думкі на паперы прыгожа і ясна, гаварыць яна магла не вельмі складна і выразна, асабліва калі хвалявалася і адчувала сябе няўпэўнена. Хоць наўрад ці гэта можа быць недзе засведчана: калі *Natrum muriaticum* гаворыць пра ідэалы, ён выпраменьвае ўнутранае святло, якое не дазваляе заўважаць недахопы ні ў знешнасці, ні ў дыкцыі.

Яна магла быць вельмі нераўнадушнай да жывёл. На мэблю, шпалеры і рознае іншае, што мае дачыненне да знешняга выгляду памяшкання, не вельмі звяртала ўвагу, бо не лічыла гэта важным, таму інтэр'ер яе салона не варта апісваць як вытанчаны ці абстаўлены з вялікім густам.

Пачуўшы непрыемную навіну, магла ўсміхнуцца або нават і каратка засмяяцца. Гэта рэфлекторнае. Смяяцца над тым, што зусім не смешна, – прыкмета ўнутранай скаванасці, прыгнечанасці эмоцый, а не раўнадушша або цынізму, як можна было б падумаць.

Жанчыны тыпу *Natrum muriaticum* часта выбіраюць прыглушаныя, няяркія адценні колераў: сінія, шэрыя, карычневыя і іншыя „зямлістыя" фарбы. Але ў іх можа ярка праяўляцца схільнасць да пурпурнага колеру. Паводле ўспамінаў сучаснікаў, у прыватнасці, Стэфаніі Сэмпалоўскай, любімым колерам пісьменніцы (прынамсі, колерам яе сукенкі на 50-гадовым юбілеі) быў ліловы (спасылка на гэты ўспамін зроблена прафесарам Святланай Мусіенка падчас інтэрв'ю)[7]. А кветкі, самыя распаўсюджаныя ў гербарыях, аформленых рукамі Элізы Ажэшкі, – фіялкі. Паміж пурпурным колерам, пра які гаворыцца ў Кэтрын Култэр, і колерам ліловым, а таксама колерам верхніх пялёсткаў фіялкі трыкалор – ці вялікая розніца?..

Маленькае папярэджванне на заканчэнне. Апантанасць некаторых даследчыкаў біяграфій гістарычных персон стварае часам вельмі істотную перашкоду аб'ектыўнасці і спрыяе „суб'ектывізму": якасці даследуемай асобы могуць несвядома дапаўняцца якасцямі самога даследчыка. Пазбегнуць такой экстрапаляцыі даволі цяжка. Ведаючы гэты факт і арыентуючыся на выніку прадстаўленага эксперымента, можна выказаць наступнае меркаванне: калі апісаны метад будзе некалі прыняты як слушны, найбольш аб'ектыўныя біяграфіі мусяць выходзіць з-пад клавіятур аўтараў – носьбітаў аднайменных канстытуцыянальных тыпаў.

**Бібліяграфія**

Budrewicz Tadeusz. Ptaki i ludzie w opowiadaniach Orzeszkowej / Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности. Сборник научных работ. – ГрГУ им. Я. Купалы, 2011. – С. 100–108.

Danek Danuta. „Urodzona w pustym gnieździe". Melancholia i pamięć nieświadoma Elizy Orzeszkowej / Danek Danuta // Śmierć wewnętrzna. Literatura w świetle doświadczenia psychoanalitycznego / Gdańsk: Słowo/obraz terytoria, 2012. – S. 127–179.

Дзянісава Святлана. „Шалёныя мігрэні ў мяне тры дні зрабавалі". Гамеапатычны падыход у раскрыцці невядомых рыс асобы Элізы Ажэшка / Полымя. – № 5. – 2016. – С. 130–138.

Кёлер Герхард. Гомеопатия. Смоленск: Гомеопатическая медицина. – 1997. – 600 с.

[7] Дзянісава С. „Шалёныя мігрэні ў мяне тры дні зрабавалі". Гамеапатычны падыход у раскрыцці невядомых рыс асобы Элізы Ажэшка / Полымя. – № 5. – 2016. – С. 130–138.

Култер Кэтрин Р. Портреты гомеопатических препаратов. Психосоматический анализ избранных конституциональных типов. Часть 2. – Москва: Гомеопатическая медицина, 2004. – 100 с.

Мусиенко Светлана. Элиза Ожешко в эстетическом пространстве Гродненщины / Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности. Сборник научных работ. – ГрГУ им. Я. Купалы, 2011. – С. 16–31.

Olech Barbara. Samotność wśród ludzi. O «Dniach» Elizy Orzeszkowej / Творчество Элизы Ожешко в эстетическом пространстве современности. Сборник научных работ. – ГрГУ им. Я. Купалы, 2011. – С. 154–164.

Orzeszkowa, E. Dnie / E. Orzeszkowa; opr. I. Wiśniewska. – Warszawa: Wydawnictwo IBL, 2001.

Orzeszkowa, E. Listy zebrane / E. Orzeszkowa; do druku przygotował i komentarzem opatrzył E. Jankowski. – T. I–IX. – Wrocław, 1954–1981.

Orzeszkowa, E. O sobie / E. Orzeszkowa. – Warszawa, 1974.

Ранкур-Лаферьер Д. „Крейцерова соната”. Клейнианский анализ толстовского неприятия секса / Доклад на пленарном заседании 15-й международной конференции „Психоанализ, литература, искусство”, Санкт-Петербург, 4 июня 1998-го года / Классический психоанализ и художественная литература / Сост. и общая редакция В. М. Лейбина. – СПб.: Питер, 2002. – С. 141–161.

**Swiatłana Dzianisowa**
*Grodno*
*Redakcja czasopisma „Młodość”*

## НЕВЯДОМЫЯ РЫСЫ НАТУРЫ ЭЛІЗЫ АЖЭШКА Ў СВЕЦЕ ГАМЕЯПАТЫІ

### Рэзюмэ

Гамеапатыя як медыцынскі напрамак адрозніваецца ад традыцыйнага (алапатыі) тым, што лекавыя сродкі ўздзейнічаюць не на хваробу, а на хворага, а хвароба з пазіцый гамеапатыі ёсць не пагаршэнне здароўя, а працэс яго ўзнаўлення. Пры гэтым прычынай парушэння функцый з’яўляецца, вобразна кажучы, „высокае напружанне” ў органах і тканках. Асабліва ўдзячна арганізм

адгукаецца на так званы канстытуцыянальны прэпарат, які адпавядае канстытуцыянальнаму тыпу. Пошук такога рэчыва для Элізы Ажэшкі, вызначэнне яе канстытуцыянальнага тыпу – задача даследавання. Аўтар прапануе праз вядомае пра пісьменніцу Элізу Ажэшку (факты жыцця і характарыстыкі асобы, атрыманыя з аўтабіяграфіі, лістоў, успамінаў, дзённікаў, аналізу публіцыстычнай і мастацкай творчасці) шляхам вызначэння канстытуцыянальнага тыпу даведацца пра тое, што ў крыніцах не засведчана.

**Słowa-klucze:** Эліза Ажэшка, гамеапатыя, хворы, арганізм, біялагічны аб'ект

**Swiatłana Dzianisowa**
*Grodno*
*Redakcja czasopisma „Młodość"*

## NIEZNANE STRONY NATURY ELIZY ORZESZKOWEJ W ŚWIETLE HOMEOPATII

### Streszczenie

Homeopatia jako kierunk medyczny różni się od kierunku tradycyjnego (alapatii) tym, że leki nie działają na choroby, lecz na pacjenta; choroba zaś z punktu widzenia homeopatii nie jest pogarszeniem stanu zdrowia, tylko procesem odnowy. W tym przypadku przyczyną zaburzeń jest, mówiąc obrazowo, „wysokie napięcie" w narządach i tkankach. Szczególnie wdzięcznie organizm reaguje na tzw. lek konstytucyjny odpowiedni do typu konstytucyjnego. Poszukiwanie takich substancji dla Elizy Orzeszkowej, określenie jej typu konstytucyjnego – to jest problem badawczy niniejszej pracy. Autor pragnie poprzez to, co wiadomo o pisarce Elizie Orzeszkowej (fakty życia i cech osobowości uzyskane z autobiografii, listów, wspomnień, pamiętników, analiz, twórczości dziennikarskiej i artystycznej), poprzez określenie typu konstytucyjnego, dopowiedzieć to, czego w źródłach brakuje.

**Słowa kluczowe:** Eliza Orzeszkowa, homeopatia, chory, organizm, obiekt biologiczny.

**Swiatłana Dzianisowa**
*Grodno*
*The „Maladost" Journal*

## UNKNOWN SIDE OF ELIZA ORZESZKOWA'S NATURE IN THE LIGHT OF HOMEOPATHY

### Summary

One difference between homeopathy as a medical approach and traditional allopathy is that the medicine does not work on a sickness, but on a patient. From the point of view of homoeopathy, sickness does not mean worsening health but the process of regeneration. The cause of disorders lie in a "high tension", so to speak, in internal organs and tissue. The organism's response is especially satisfying in reaction to so called constitutional remedy appropriate for a given constitutional type. The research problem of this paper is finding such a remedy for Eliza Orzeszkowa and determination of her constitutional type. The author wants to use what is known about Eliza Orzeszkowa (facts from her life and personality traits obtained from autobiographies, letters, memoirs, diaries, analyses, journalistic and artistic work) to define her constitutional type and supplement the gaps in the sources.

**Keywords:** Eliza Orzeszkowa, homeopathy, organism, biological object.